baj.media

БАЖ – гэта
пра медыя,
baj.media

ЭЛЕКТРОННЫ БЮЛЕТЭНЬ

# СМІ
## Ў БЕЛАРУСІ

№3 (81)
2025



# СМІ Ў БЕЛАРУСІ Ў ЛІПЕНІ — ВЕРАСНІ 2025 ГОДА. АГЛЯД

**У ліпені-верасні 2025 г. улады працягвалі ціснуць на журналістаў у Беларусі і абмяжоўваць доступ да інфармацыі наступным чынам:**

- крымінальны пераслед, затрыманні і іншыя формы ціску на журналістаў;
- забарона неафіцыйных (у тым ліку замежных) крыніц інфармацыі пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам;
- пашырэнне цэнзуры, у прыватнасці, фактычнае прыцягненне насельніцтва да складання спісу забароненых да распаўсюду кніг.

Разам з тым у гэты перыяд, **дзякуючы дыпламатычным намаганням ЗША, адбылося масавае вызваленне палітзняволеных — у тым ліку, журналістаў і блогераў**. Сярод 52-х палітзняволеных, 11 верасня вывезеных у Літву амерыканскай дэлегацыяй на чале з Джонам Коўлам, **на волю** *выйшлі* **дванадцаць супрацоўнікаў медыя і блогераў**: Ірына Слаўнікава, Мікола Дзядок, Павел Мажэйка, Аляксандр Манцэвіч, Ларыса Шчыракова, Яўген Меркіс, Алена Цімашчук, Вячаслаў Лазараў, Павел Падабед, Ігар Лосік, Зміцер Казлоў і Павел Вінаградаў.

Неабходна адзначыць, што большасць з былых вязняў былі пазбаўленыя дакументаў і магчымасці выбару краіны пражывання, а само «вызваленне» фактычна было дэпартацыяй (выправаджэннем з Рэспублікі Беларусь). Пра лёс палітыка Міколы Статкевіча, які адмовіўся выязжаць на такіх умовах з Беларусі, нічога не вядома.

15 верасня **Беларуская асацыяцыя журналістаў** зацвердзіла **стратэгію сваёй працы на 2025–2027 гады**. У стратэгіі адзначаецца неабходнасць вяртання арганізацыі і ўсяго незалежнага медыясектара ў Беларусь, аднаўлення легальнай дзейнасці ў краіне, важнасць беларускамоўнага і нацыянальнага кантэнту для захавання нацыянальнай ідэнтычнасці аўдыторый.

## Крымінальны пераслед. Затрыманні ў Беларусі

Працягваўся крымінальны пераслед журналістаў як унутры краіны, так і завочна. За тры месяцы **былі асуджаны па крымінальных абвінавачваннях трое журналістаў і блогерка**, узбуджаны **12 новых крымінальных спраў** (з іх 9 — у адносінах да журналістаў у эміграцыі).



Даніла Палянскі

Брэсцкі журналіст-фрылансер **Даніла Палянскі** 25 ліпеня ў закрытым судовым працэсе быў прызнаны вінаватым у «здрадзе дзяржаве» (артыкул 356 Крымінальнага кодэкса) і прысуджаны да 10 гадоў пазбаўлення волі і штрафу памерам каля 7135 USD. Праз «засакрэчанасць» судовага працэсу уласна сутнасць абвінавачанняў застаецца невядомай.

8 жніўня яшчэ адзін брэсцкі журналіст — **Алег Супрунюк**, які раней супрацоўнічаў з шэрагам незалежных выданняў, быў асуджаны да 3 гадоў пазбаўлення волі за ўдзел у «экстрэмісцкім фармаванні».

Нягледзячы на тое, што Супрунюк мае інваліднасць, да суда ён больш за паўгады ўтрымліваўся пад вартай.



Ігар Ільяш. Фота: старонка Сяргея Ваганава ў Facebook

16 верасня ў Мінску завяршыўся працэс над журналістам **Ігарам Ільяшом**, мужам палітзняволенай журналісткі Кацярыны Андрэевай. Суд *прызнаў* Ільяша вінаватым паводле двух крымінальных артыкулаў: 369–1 (дыскрэдытацыя Рэспублікі Беларусь) і 361–4 (садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці) і прызначыў яму 4 гады пазбаўлення волі з адбыццём у калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму і штраф памерам 4200 рублёў.

7 ліпеня мазырскую блогерку **Паліну Зыль**, якая была ў вышуку і заставалася ў Беларусі, *прысудзілі* да года калоніі па артыкуле аб грубым парушэнні парадку (арт. 342 Крымінальнага кодэкса).

У Беларусі за ліпень-верасень 2025 г. *сталі* абвінавачанымі ў крымінальных справах і трапілі пад варту як найменш тры журналісты (з іх апублікавана імя **Кірыла Пазняка**).



Вольга Старасціна. Фота: «Белсат»

Дзевяць беларускіх журналістаў замежжа сталі фігурантамі крымінальных спраў завочна. Сярод іх — супрацоўнікі тэлеканала «Белсат» *Вольга Старасціна* (другая крымінальная справа) і *Яраслаў Сцешык*, яго былыя супрацоўнікі **Сяргей Скулавец** і *Андрэй Мялешка*. Імёны яшчэ пяцярых журналістаў не разгалошваюцца.

Блогера **Максіма Шабуцкага** *завочна абвінавацілі* адразу паводле васямнаццаці артыкулаў Крымінальнага кодэкса.




Журналіст Кірыл Пазняк. Скрыншот відэа

Па інфармацыі БАЖ, адбыліся **тры затрыманні** незалежных журналістаў у Беларусі. У прыватнасці, 4 верасня, у дзень прызнання *«экстрэмісцкім фарміраваннем»* YouTube-канала «Платформа 375», *затрыманы* журналіст Кірыл Пазняк, названы датычным да гэтага канала.

Адбыліся **адзінаццаць вобшукаў** па месцах жыхарства журналістаў або іх родных, верагодна звязаныя з крымінальным пераследам. Так, журналіст-фрылансер **Аляксандр Гойшык**, які не жыве ў Беларусі, *паведаміў*, што да ягонай маці ў Салігорску прыходзілі міліцыянты і шукалі яго як «злоснага экстрэміста».

*Былі абвешчаныя* ў міждзяржаўны вышук (гэта значыць таксама ў Расійскай Федэрацыі) палітычныя аналітыкі, аднесеныя беларускім міністэрствам унутраных спраў да «экстрэмісцкага фарміравання» — інфармацыйнага агенцтва «Позірк» — **Аляксандр Класкоўскі**, **Пётр Рудкоўскі** і **Аляксандр Фрыдман**, а таксама *журналісткі* **Таццяна Каравянкова** і **Глафіра Жук**.

## Выкарыстанне «антыэкстрэмісцкага» заканадаўства для пераследу за распаўсюд інфармацыі незалежных медыяў

«Барацьба з экстрэмізмам» па-ранейшаму выкарыстоўвалася для абмежавання доступу да незалежных крыніц інфармацыі і пераследу журналістаў.

**Чатыры медыярэсурсы былі прызнаныя экстрэмісцкімі фарміраваннямі**: TikTok-акаўнт *«Навіны Гродна і вобласці»*; кааліцыя ініцыятыў *«Зялёная сетка» (Green Network),* якая ўключае праекты «Belarus Beehive», «Зялёны партал» і «Экадом»; стрымінгавая платформа *«Belarus Tomorrow»*, якая аб'ядноўвае вядучыя беларускія медыя, блогераў і экспертаў; YouTube-канал *«Платформа 375»*.

Вялікая колькасць неафіцыйных крыніц інфармацыі *прызнавалася* экстрэмісцкімі матэрыяламі і трапляла ў «Рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў». У ім апынуліся, напрыклад, YouTube-канал «Delfi Литва» (літоўскі сайт навін DELFI.lt заблакаваны ў Беларусі з 2023 года), акаўнты расійскага журналіста і відэаблогера Іллі Варламава ў сацыяльных сетках, Instagram-акаўнт намесніка старшыні БАЖ Барыса Гарэцкага.

У сувязі з распаўсюджваннем «інфармацыі, якая можа нанесці шкоду нацыянальным інтарэсам» пракуратура Магілёўскай вобласці *забараніла* доступ да папулярнага ўкраінскага сайта навін *«Главком»*, а таксама сайтаў праваабарончых праектаў: беларускага «Праваабаронцы супраць катаванняў» і расійскага «Мемориал ПЗК».


Аліна Коўшык. Фота: Белсат

Камітэт дзяржаўнай бяспекі Беларусі *ўключыў* у «пералік арганізацый і фізічных асоб, якія маюць дачыненне да тэрарыстычнай дзейнасці» кіраўніцу тэлеканала «Белсат» **Аліну Коўшык**. Гэта звязана з тым, што 9 ліпеня 2025 года Генеральная пракуратура прызнала «тэрарыстычнай арганізацыяй» Аб'яднаны пераходны кабінет, да якога Коўшык раней мела дачыненне.

У пералік асоб, «датычных да экстрэмісцкай дзейнасці», Міністэрствам ўнутраных спраў РБ *былі ўключаныя* блогеры **Руслан Ліннік** (паўторна асуджаны пасля 4 гадоў зняволення) і **Антон Матолька** (завочна асуджаны да 20 гадоў пазбаўлення волі).

## Ідэалагізацыя і цэнзураванне інфармацыйнай і выдавецкай сфераў



Міністэрства інфармацыі. Фота: Reform.by

19 верасня *было зацверджана* новае Палажэнне аб Міністэрстве інфармацыі. У пералік асноўных задач Міністэрства дадалося *«інфармацыйнае суправаджэнне ідэалагічнай працы ў Рэспубліцы Беларусь, інфармацыйнае забеспячэнне і суправаджэнне дзяржаўнай палітыкі ў сферы масавай інфармацыі і выдавецкай справы»*.

Міністэрства інфармацыі *актывізавала* дзейнасць па выяўленні і забароне непажаданых кніг. Так, 8 верасня намеснік міністра інфармацыі Дзяніс Язерскі заявіў у час тэлеэфіра, што спадзяецца на дапамогу насельніцтва, якое будзе праяўляць актыўнасць і паведамляць пра выданні, вартыя ўключэння ў «спіс друкаваных выданняў, якія змяшчаюць інфармацыйныя паведамленні і (або) матэрыялы, распаўсюджванне якіх здольна нанесці шкоду нацыянальным інтарэсам Рэспублікі Беларусь». На той момант у спісе, па словах Язерскага, было *«143–145 кніг»*.

Да канца верасня гэты спіс *быў дапоўнены* яшчэ 32 найменнямі.

**БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ**

baj.media

Змест гэтага электроннага выдання абаронены нормамі Аўтарскага права.
Спасылка на «Беларуская асацыяцыя журналістаў» пры выкарыстанні матэрыялаў ЭЛЕКТРОННАГА БЮЛЕТЭНЯ «СМІ Ў БЕЛАРУСІ» з'яўляецца абавязковай.

Кантакт:
Андрэй Бастунец

E-mail: office@baj.media
Web: https://baj.media/be

2025